**Віншаванні біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча на ўрачыстасць Уваскрасення Пана 2023**

*«Спакой пакідаю вам, спакой Мой даю вам.*
*Не так, як дае свет, Я вам даю.*
*Няхай не трывожыцца сэрца вашае і не баіцца» (Ян 14, 27).*

Умілаваныя ў Хрысце Пану браты і сёстры! Дарагія вернікі нашай дыяцэзіі!

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!

Вось стаім ля пустой Грабніцы Езуса Хрыста. Тое, што здавалася канцом і трагедыяй, у ззянні Уваскрасення атрымлівае новае, поўнае значэнне. Нас прасякае і ўзрушвае навіна: Езус жывы, перамог пакуту і смерць! Уваскрос! Хрыстус сапраўды з намі! Ён запэўніў у гэтым спалоханых апосталаў і запэўнівае нас.

Гэты святочны час з'яўляецца для нас нагодай па-новаму адкрыць з радасцю, што Бог у Езусе Хрысце сапраўды хоча быць для нас прыстанкам і моцай, самай паспяховай дапамогай у кожнай жыццёвай справе, асабліва ж у штодзённых клопатах і нягодах.

Хрыстус, адчыняючы нам брамы жыцця вечнага (пар. Ян 10, 1-21), прыносіць жаданы дар міру, якога свет даць не можа (пар. Ян 14, 27). Будзем жа напаўняць свае сэрцы гэтым Божым дарам, патрэбным сучаснаму чалавеку і свету. Дзякуючы гэтаму ў нас будуць нараджацца пачуцці прабачэння і братэрства, у нашых сэрцах згасне нянавісць і жаданне насілля, а ў іншым чалавеку мы ўбачым не ворага, якога трэба перамагчы, а брата, якога належыць прыняць і любіць, каб супольна будаваць лепшы свет.

На сёлетні пасхальны час жадаю вам Моцы, якую можа даць толькі Уваскрослы Хрыстус; Святла, якое апраменьвала б кожную вашу справу; Надзеі, якая б ніколі ў вас не згасла, і Любові, якая дапамагла б вам пераадолець усялякія цяжкасці і цярпенні.

Няхай Хрыстус адорвае вас сваім благаслаўленнем, здароўем і патрэбнымі ласкамі. Няхай выбавіць ад заразы, голаду, агню і вайны, а таксама адорыць нашы часы мірам. Сапраўдным мірам паміж нашымі народамі, у нашых сем'ях і ў кожным чалавечым сэрцы.

Усім вам жадаю шчаслівага святкавання і ад усяго сэрца благаслаўляю.

Аляксандр Кашкевіч
Біскуп Гродзенскі